УДК 82.09-1+82.0

**Я. А. Гараднiцкi**
Iнстытут лiтаратуразнаўства iмя Янкi Купалы
Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы i лiтаратуры НАН Беларусi

## ТЭМА ЛЕСУ Ў БЕЛАРУСКАЙ ЛIТАРАТУРЫ

Прадметам даследавання ў артыкуле з'яўляецца ўвасабленне тэмы лесу ў творах беларускiх аўтараў. Дадзеная тэма рэалiзуецца ў шматстайнасцi вобразаў i матываў, якiя звязаны з уяўленнямi пра лес як важнейшую сферу iснавання чалавека. Беларускiя пiсьменнiкi заўсёды праяўлялi павышаную цiкавасць да ўсяго, што датычыцца прыроднага асяроддзя. Тэма лесу была адной з самых актуальных на працягу ўсяго гiстарычнага развiцця нацыянальнай лiтаратуры.

Вобразы лесу i яго насельнiкаў выяўляюцца ў творах беларускай лiтаратуры ў рэалiстычным, мiфалагiчным i сiмволiка-алегарычным плане. Важную ролю ў мастацкай сiстэме лiтаратуры адыгрываюць сiмвалiчныя вобразы дуба, сасны, бярозы i iнш. Звяртаючыся да тэмы лесу, беларускiя пiсьменнiкi выяўляюць грамадзянскую заклапочанасць пра яго захаванне для нашчадкаў. Асаблiва выразна матывы абароны лесу гучаць у паэзii П. Панчанкi. Глыбокi фiласофскi змест характэрны для лясных вобразаў i матываў у творах Якуба Коласа, А. Куляшова, А. Пысiна, А. Разанава i iншых беларускiх паэтаў. У беларускай прозе тэма лесу таксама мае важнае значэнне. Апiсаннi ляснога пейзажу складаюць iстотную частку сюжэтаў празаiчных твораў.

**Ключавыя словы:** лiтаратура, тэма, вобраз, сiмвал, прыроднае асяроддзе, лес, дрэва.

**Ya. A. Haradnitski**
Institute of Literary Studies named after Yanka Kupala, Research Center of the Belarusian Culture, Language and Literature of the National Academy of Sciences of Belarus

## THE FOREST THEME IN BELARUSIAN LITERATURE

The subject of research in the article is the embodiment of the forest theme in the works of Belarusian authors. This theme is implemented in a variety of images and motifs that are associated with the concept of the forest as an important sphere of human existence. Belarusian writers have always shown an increased interest in everything that concerns the environment. Forest theme was one of the most important throughout the historical development of the national literature.

Forest image and its inhabitants are identified in the work of Belarusian literature in a realistic, mythological, symbolic and allegorical plan. Important role in the artistic system of literature play symbolic images of oak, pine, birch etc. Referring to the theme of the forest, Belarusian writers show their civil concern about its preservation for future generations. More emphatically forest protection motives sound in P. Panchanka's poetry. Deep philosophical content inherent to the forest images and motifs in the works of Yakub Kolas, A. Kulyashou, A. Pysin, A. Razanau and other belarusian poets. In Belarusian prose forest theme also has an important meaning. Descriptions of the forest landscape are an essential part of plots in prose works.

**Key words:** literature, theme, image, symbol, environment, forest, tree.

**Уводзiны.** Тэма лесу – адна з самых асноўных, найбольш распаўсюджаных у беларускай лiтаратуры. Яе можна супаставiць па значнасцi з тэмай зямлi, якая для нацыянальнай лiтаратуры, асаблiва класiчнай, з'яўляецца прадметам асаблiвай увагi. Зямля, лес, поле, луг, рака – гэта тыя асноўныя вобразы-топасы прыроднага асяроддзя, з якiмi неад'емна спалучана экзiстэнцыйнае iснаванне герояў лiтаратурных твораў самых розных жанраў. Кожны чалавек, нягледзячы на тое, вясковец ён цi гараджанiн, судакранаўся неаднойчы ў жыццi з гэтымi праявамi прыроднага свету. Цяжка, мабыць, знайсцi i аўтара, якi б не звяртаўся нiколi ў сваёй творчасцi да тэмы лесу i лясных вобразаў i матываў.

Даследаванне шырока прадстаўленай у нацыянальнай лiтаратуры тэмы лесу магчыма праводзiць у некалькiх кiрунках. Нам уяўляюцца перспектыўнымi наступныя падыходы: 1) аналiз вобразаў-сiмвалаў (такiх, напрыклад, як вобраз дуба) i iх значэння ў агульнай мастацкай сiстэме; 2) вызначэнне функцыянальнай ролi лясных вобразаў i матываў у развiццi сюжэта лiтаратурнага твора;

3) выяўленне аўтарскага аўтабіяграфічнага падтэксту ў раскрыцці тэмы лесу, абумоўленасці звароту да дадзенай тэмы жыццёвымі акалічнасцямі і светапогляднымі прыярытэтамі пісьменніка.

**Асноўная частка.** Тэма лесу з яго таямнічасцю, загадкавасцю, неспазнанасцю і, разам з тым, душэўнай блізкасцю настрою і менталітэту беларуса ўзнікае яшчэ ў даўнія часы. Да яе распрацоўкі мае непасрэдныя адносіны фальклор, у творах якога лясному жыццю і лясным жыхарам надаецца істотнае значэнне. Прысутнасць тэмы лесу выразна заяўляе пра сябе ў творах старажытнай беларускай літаратуры. У XVI ст. Міколам Гусоўскім была напісана на лацінскай мове паэма «Песня пра зубра», у якой выведзены ва ўсёй велічы вобраз магутнага волата беларускіх пушчанскіх абшараў. У гэтым творы, які атрымаў новае жыццё ў беларускамоўных перакладах напрыканцы XX ст., лес паўстае як вобраз глабальнага значэння, сімвалічнае ўвасабленне прыроднай стыхіі.

Асабліва шырока і шматстайна прадстаўлена лясная тэма ў беларускай літаратуры, пачынаючы з XIX ст., калі пісьменнікі сталі арыентавацца на дэмакратычную чытацкую аўдыторыю, а ў творах з'явіўся герой – прадстаўнік народнага асяроддзя. Значны ўклад у распрацоўку дадзенай тэмы ўнёс Янка Лучына, аўтар вядомай паэмы «Паляўнічыя акварэлькі». Я. Лучына, паэт, які пісаў на трох мовах – беларускай, рускай і польскай, скончыў Пецярбургскі тэхналагічны інстытут. Тэма лесу знайшла таксама шматбаковае ўвасабленне ў творчасці класікаў беларускай літаратуры – Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча і інш. У многіх творах беларускай літаратуры лес выяўляецца рэалістычна, паказваецца як працяг жыццёвага асяроддзя чалавека. Аднак даволі часта вобразы і матывы, звязаныя з лясной тэматыкай, мастацка трансфармуюцца, метафарычна і міфалагічна пераўтвараюцца, выступаюць у якасці паэтычных сімвалаў. У паэмах Купалы «Магіла льва», «Сон на кургане» лес сімвалізуе сабой рамантызаваны, міфалагічна трансфармаваны свет, які супрацьстаіць волі індывідуума.

У міфалагічным вобразным увасабленні прадстаўлены лясны свет у паэзіі М. Багдановіча. У вершы «Чуеш гул? – Гэта сумны, маркотны лясун...» з цыкла «У зачараваным царстве» рэалізуецца антыномія *прыроднага – душэўнага*. Пачынаецца верш з акцэнту на гукавых з'явах. Спачатку гэта суцэльны, адзіны «гул» – гранне лесуна, якое сімвалізуе сабой цэласнасць міфалагічнага светаўспрымання. Пры гэтым лесунова гранне выяўляецца праз пластыку зрокава ўяўляемай вобразнасці: гэта гучанне – самараскрыццё самой прыроды, сосен – «тысячаў крэпка нацягнутых струн».

Лес, як блізкая чалавеку прыродная стыхія, яскрава і маштабна выяўлены ў паэме Коласа «Новая зямля». Дзеянне гэтага твора адбываецца ў лесніковай пасадзе і ў навакольных лясных абшарах. «Новая зямля» – твор аўтабіяграфічны. Паэт, які нарадзіўся ў сям'і лесніка, апісвае лясныя краявіды дэталёва і маляўніча, як свет, для яго родны і блізкі. І ў жыцці Колас заўсёды быў адданы ляснfestому свету, нават і ў паважным узросце вельмі любіў, напрыклад, паходы ў грыбы.

Асаблівую значнасць выяўленаму ў «Новай зямлі» Я. Коласа свету прыроды і жыцця чалавека ў суладнасці з ёю надае адкрытасць выявы перад касмічна-быццёвай перспектывай. Усё, што адбываецца ў жыцці герояў у яго звыклым кругабегу і прадвызначанасці, не абмяжоўваецца паказам толькі прадметнага. Над рэчыўным і прыродным у паэме узносіцца ў недасяжныя вышыні нябесная прастрань, і менавіта яна сімвалічна прадстаўляе вышэйшы духоўны пачатак. Істотным момантам у апісанні лесніковай пасады і бліжэйшага да яе наваколля з'яўляецца не толькі выяўленае на зямлі, тое, што трывала звязанае з адвечным сялянскім побытам, але і тое, што ўзвышаецца над ім, даючы магчымасць паўней далучыцца да Боскага, універсальнага, анталагічнага. «Святое аддаленне» – такое паняцце, такое духоўнае вымярэнне ўводзіць аўтар паэмы ўжо на самым пачатку яе, пры апісанні лесніковай пасады. Такі ракурс бачання (з аддалення, ад нейкага пункту Абсалюту) надае гарманічную ўраўнаважанасць і завершанасць карціне быцця, спалучаючы рэчыўнае і духоўнае ва ўзаемазвязанае цэлае.

А хвоі, елкі векавыя
Пад зыкі песень маладыя
Маўчком стаялі ў нейкай думе,
І ў іх ціхусенечкім шуме
Няслось вячэрняе маленне
Ўгару, святое аддаленне [1, с. 7].

Лясныя вобразы з'яўляюцца своеасаблівымі «персанажамі» многіх твораў-прытчаў з «Казак жыцця» Я. Коласа. Адлюстраваліся яны і ў лірыцы класіка беларускай літаратуры. Хрэстаматыйным творам стаў верш «Дуб» – хваласпеў паэта ў гонар магутнага волата беларускіх лясоў.

Па-асабліваму загучала лясная тэма ў гады Вялікай айчыннай вайны, калі шырока разгарнулася партызанскае змаганне супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. «Лясная песня» кампазітара Уладзіміра Алоўнікава, створаная на словы Адама Русака, стала мастацкім помнікам як беларускім партызанам, так і іхняму ахоўніку і прытулку – беларускаму лесу.

У беларускай паэзіі другой паловы XX ст. тэма лесу (і шырэй: адносін чалавека з прыродным светам, жыцця на зямлі) становіцца прадметам філасофскага асэнсавання ў лірыцы Аркадзя Куляшова. Трывогай і заклапочанасцю паэта і грамадзяніна наконт зберажэння цывілізацыі

прасякнуты вершы з яго кнігі паэзіі «Сасна і бяроза». Сімвалічныя вобразы сасны і бярозы, якія ўтрымліваюць сваімі каранямі свет, знаходзяцца ў адным шэрагу з такімі маштабнымі вобразамі-канцэптамі выдатнага паэта, як хуткасць, шлях, акіян і інш.

Публіцыстычным паэтычным словам становіцца на абарону лесу ад людской прагавітасці і нядбальства П. Панчанка. Верш П. Панчанкі «Лясныя воблакі», змешчаны ў аднайменным зборніку, уяўляе сабой пафаснае спалучэнне лірычнага выказвання з публіцыстычнай завостранасцю слова. Пачынаецца твор з прасякнутага пяшчотай любавання малюнкам ляснога прыволля: Сонца праз лісце – / Сонца праз лісце – / Хораша лес мой зялёны шуміць [2, с. 18]. Аднак тут жа, у той самай страфе паяўляецца нота, якая сведчыць пра паварот думкі паэта ў іншым кірунку. Ва ўяўленні аўтара лясная прыгажосць асацыюецца з адсутнасцю ў чалавека прагматычнага, карыслівага стаўлення да прыроды. Пра гэта ўспомнена невыпадкова. Выяўленне лірычнай ідыліі перарываецца раптоўна змрочным відовішчам варварскага знішчэння.

Ссечаны ельнік,
Бярэзнік знявечаны,
Нават рабінку –
Лязом папалам.
Можа, канчаецца
Род чалавечы?
Дзікае, хамскае
Смецце і хлам [2, с. 19].

Супастаўленне дзвюх кантрасных выяў эмацыйна ўздзейнічае на свядомасць чытача, выклікае ў яго рэакцыю нязгоды, пратэсту. Рытарычныя сродкі паэтычнага выражэння скіраваны на ўзмацненне сугестыўнага ўздзеяння, перакананне ў згубнасці для прыроды і самога чалавека спажывецкай ідэалогіі.

Імкненне абараніць лес ад зламысных пасяганняў адчувальна ў вершах А. Пысіна, паэта, у творчасці якога тэма лесу займае значнае месца. Адзін з вершаў на гэтую тэму пачынаецца з такога прызнання:

І чаму не стаў я леснікам,
Лес мой, брат мой…
Быў бы я тваім замком
І тваёю брамай [3, с. 107].

Неажыццёўленая мара аб прафесіі ахоўніка лясных скарбаў пакінула трывалы след у свядомасці паэта, выявілася ў яго асаблівай прыхільнасці да вобразаў і матываў лясной тэматыкі. Для філасофска-элегічнай паэзіі А. Пысіна характэрна своеасаблівая сістэма вобразаў, праз якую раскрываюцца погляды аўтара на лес. У большасці вершаў дадзенай тэматыкі лясныя краявіды выяўляюцца ў непасрэднасці паэтычнага ўспрымання, у прадметна адчувальных выніках сузірання. У той жа час лірычная рэфлексія паэта ўздымаецца да філасофскага абагульнення, скіроўваецца да разгадкі таямніц быцця. А. Пысін валодаў здольнасцю выявіць у лірычным вершы асобнае імгненне існавання, надзяліўшы яго адчуваннем значнасці, далучанасці да вечнага. Тое, з чым адбывалася непасрэднае пачуццёвае судакрананне, пэўным чынам суадносілася з неабсяжнасцю, з усім універсумам.

Лясная тэма трывала паяднана ў паэзіі А. Пысіна з галоўнай для яго ваеннай тэмай. У вершах паэта сустрэнем нямала запамінальных вобразаў, у якіх духоўны і эмацыянальны вопыт паэта-франтавіка перадаецца праз судакрананне з лясным асяроддзем. Лес прадстае як сімвалічнае ўвасабленне адвечнасці прыроды. Сутыкненне вечнага і ўстойлівага з трагічнымі абставінамі ваеннага часу выклікае пачуццё, якое пазначаецца характэрным для пысінскай паэтыкі словам *рэквіем*. Памяць паэта пра палеглых у змаганні з ворагам сяброў-аднапалчан канкрэтызуецца праз пэўныя вобразныя прыкметы і адзнакі. Зварот да лясных вобразаў надае гучанню твораў А. Пысіна асаблівую элегічную ўрачыстасць рэквіемнага характару. «Байцам спявае рэквіем сасоннік, / Карэннем дол сплятаючы гусцей» [3, с. 13] – гэтыя радкі паказальныя ў плане ўзаемадзеяння ў вершах паэта двух істотных для яго тэматычных пластоў. Адвечны спакой прыроды і катаклізмы ваеннага ліхалецця, якія закранаюць і самую прыроду – гэтая антыномія раскрываецца ў творах А. Пысіна якраз праз лясныя вобразы. У вершы «Асвейскія ручнікі» рэаліі бою перадаюцца аўтарам праз вобразныя выявы, у якіх драматычна пераўвасабляецца прыроднае наваколле: «І выбухі ўстаюць бязліста, / Як марсіянскія кусты» [3, с. 28].

Анталагічная паяднанасць прыроднага і чалавечага ў паэзіі А. Пысіна выяўляецца праз вобразы-сімвалы дрэў. Глыбокай змястоўнасцю пазначаны верш пра «сірацінку-рабінку», якая вырасла наўзбоч ледніковага валуна. Яе выява пададзена не ў статыцы, а ў дачыненнях з жыццём чалавека. Лірычны герой верша праносіць дарагі для яго вобраз праз усё сваё жыццё, і нават за мяжой зямнога існавання не жадае раставацца з тым, што ўяўляецца яму ўвасабленнем ўсеагульнай наканаванасці.

Па пяску, па суглінку
З вясны у вясну
Сірацінку-рабінку
Нясу і нясу.
Лёгка нёс бы, хоць колы
Павыбілі шлях, –
Ды валун ледніковы
Ў яе на нагах.
На апошнім прыпынку
Ў суровай жальбе
Апушчу я рабінку
На грудзі сабе [4, с. 96].

Углядаючыся ў пачатак свайго жыцця, які хаваецца дзесьці ў змроку часавай аддаленасці, лірычны герой прыкмячае невыразныя для яго цяпер абрысы. «Пакалыхваюцца сілуэты: / Дрэвы, дрэвы ці мае гады» [5, с. 7]. Калі чалавек адыходзіць назаўжды, адзнакі пражытага ім жыцця застаюцца не толькі ў яго справах, здзяйсненнях, але быццам пакідаюць след і на аб'ектах прыроднага асяроддзя. Лірычны герой А. Пысіна імкнецца адшукаць гэтыя прыкметы, разгледзець працяг сваіх палеглых пабрацімаў у красаванні вечна жывой прыроды. «Зразумець мы хочам мову / Вешчых траў і светлых дрэў: / Можа, ў іх ёсць тыя словы, / Што сказаць хтось не паспеў» [5, 11].

Актуальнасць лясной тэматыкі, цесна перапleценай з іншымі вобразамі і матывамі, адлюстроўваецца ў саміх назвах кніг. Дадзеная тэндэнцыя датычыцца не толькі паэзіі. Можна згадаць, напрыклад, раманы «Сасна пры дарозе» і «Вецер у соснах» з ваеннай трылогіі Івана Навуменкі, раман «Пушча» Віктара Карамазава і інш. Лес – адзін з важнейшых прыродных асяродкаў, істотнейшых топасаў прыроднага свету ў творчасці І. Навуменкі. Тэма лесу займае значнае месца ў раманнай трылогіі І. Навуменкі («Сасна пры дарозе», «Вецер у соснах», «Сорак трэці»). Звяртае на сябе ўвагу адметнасць прасторавых вобразаў раманаў «ваеннай» трылогіі пісьменніка, якія вызначаюцца сваёй выразнай прадметнай адчувальнасцю, набліжанасцю да рэалій паўсядзённага жыцця, выяўленнем праз іх практычнага вопыту асваення чалавекам рэчаіснасці. Разам з тым важна падкрэсліць і іх сімвалічны і канцэптуальны сэнс. Адным з важнейшых пунктаў назірання ў першым рамане з'яўляецца ўзгорак ля чыгуначнай будкі, з якога адкрываецца панарама мястэчка, і сасна на ім – як арыенцір у прасторы. Менавіта тут, пад сасной на чыгуначным пераездзе, ля будкі абходчыка, чытач упершыню сустракаецца з галоўным героем трылогіі – Міцем Птахам і яго школьнымі сябрамі.

Вобраз сасны неаднойчы ўзнікае на старонках усіх трох «ваенных» раманаў І. Навуменкі. Гледзячы на сасну, Міця Птах успамінае іншыя абставіны, мірнае жыццё, поўнае спадзяванняў і надзей. Вобраз гэтага дрэва спалучае сабою не толькі прасторавыя абсягі; вакол яго канцэнтруецца ў памяці юнака ўсё тое, што зусім нядаўна было такім блізкім і зразумелым.

У творах І. Навуменкі пазнейшага часу, у 1990-я гады лясная тэма знаходзіць свой працяг. Сярод разнастайнасці дрэў варта вылучыць вобразы дубоў. Сімволіка гэтых вобразаў, абярэгаў мястэчка ды і ўсяго Палесся, успрымаецца скрозь прызму экалагічных трывог, якія характарызуюць светаўспрыманне аўтара-апавядальніка: «На дальніх і блізкіх пагорках узвышаюцца дубы. Усё меней і меней становіцца гэтых прыгожых волатаў у ваколіцах мястэчка» [6, с. 187].

У аповесці М. Купрэева «Палеская элегія» герой-апавядальнік знаходзіць у лясным гушчары часовы прыпын сваім вандраванням. Твор пачынаецца з выявы пня, на якім сядзіць герой, назіраючы за лясным жыццём навокал. Гэты, здавалася б, зусім нязначны прадмет у агульным прасторавым асяроддзі мастацкага свету на самой справе выконвае ролю сімвалічнага знака. Гэта пункт у прасторы, з якім асацыіруецца лакалізацыя героя як назіральніка; тое месца, дзе ён, інтэнсіўна ўспрымаючы навакольнае, пагружаецца разам з тым у свой унутраны свет, засяроджваецца на перажыванні пэўных істотных для яго самаўсведамлення момантаў мінулага. З гэтага *«свайго пня»* герою адкрываюцца далёкія быццёвыя далягляды. «Па цёплым, мяккім імху босы пайшоў на ўзлесак, да свайго пня, сеў на ім, звесіў ногі, бачыў перад сабой разбіты асфальт, за ім – пажоўклую атаву, чорны бераг Бобрыка...» [7, с. 215]. Так непрыкметна адбываецца ў свядомасці героя пераход ад рэальнасці ў свет уявы, каб пасля зноў вярнуцца да рэальных экзістэнцыйных абставін.

Своеасабліва вырашаецца тэма лесу ў філасофскай паэзіі А. Разанава. У яго першым зборніку вершаў «Адраджэнне» (1970) было змешчана некалькі твораў, у якіх аўтар разглядае лес як адну з важнейшых быццёвых сфер, з якой непасрэдна звязана існаванне чалавека. Гэтыя разгорнутыя ў сваёй наратыўнай перспектыве вершы названы паэтам лаканічна: «Лес», «Дрэвы». У такім падыходзе выявілася характэрная рыса паэтыкі А. Разанава. У дадзеным зборніку большасць вершаў названа менавіта такім чынам – лаканічна, адным словам. Паэт засяроджваецца на нейкай пэўнай, канкрэтна абазначанай з'яве, аднак уключае яе ў шырокі быццёвы кантэкст.

У вершы «Лес» прадметам паэтычнай рэфлексіі становіцца дыхатамія блізкага-далёкага, прадметнага-трансцэндэнтнага. Уласцівасць зроку ўспрымаць аддаленыя прадметы, у прыватнасці лясны відарыс, у зменлівым каляровым увасабленні дае аўтару падставы для роздуму над дыялектычнай сутнасцю быцця. Тое, што падаецца блізкім і звыклым, што акружае чалавека ў яго паўсядзённым жыцці, пры пэўных умовах можа пераўтварыцца ў незвычайнае, прадстаць у новым святле як невядомае і неспазнанае. «Там – лес / блакітны па лісці. / Ён задумёны, / незнаёмы… / Мне ў лес блакітны / не ўвайсці, / калі ўвайсці – / ўвайсці ў зялёны» [8, с. 12]. Гэтыя дзве грані быцця прадстаюць перад лірычным героем у сваёй асобнасці («іх між сабой не прыміру, / яны не хочуць прымірэння») [8, с. 12] і разам з тым яны неабходныя чалавеку для выяўлення паўнаты быцця. Розным – у залежнасці ад пункту гледжання героя – паўстаў адзін і той жа аб'ект увасаблення – лес,

рэальны і ў той жа час мройліва-запаветны. Менавіта слова *запавет* (як удакладненне прыродных законаў з боку духоўнасці) паэт выбірае ў якасці завяршальнага акцэнту верша:

І, не ствараючы законаў,
але стварыўшы запавет,
падыдзе блізка свет зялёны,
адыдзе ўдаль блакітны свет [8, с. 14].

У вершы «Вытокі» з таго ж самага зборніка А. Разанава лясны свет пададзены ў гістарычнай рэтраспектыве, як асяродак існавання старажытнага чалавека. «Праз лясы сцяжына тчэцца – / каляіна, / капыток… / Там маленства чалавецтва. / Там пачатак. / Там выток» [8, с. 32].

У міфалагізаваным ракурсе ўспрымання ўвасабляецца вобраз лесу ў паэзіі А. Сыса. Адна з першых кніг паэта атрымала характэрную назву «Пан Лес». Аналіз вершаў, змешчаных у ёй, дае падставы для сцвярджэння, што А. Сыс, выяўляючы ў яскравых паэтычных вобразах-міфалагемах лясны свет, прадаўжае традыцыі, закладзеныя М. Багдановічам. Лес паўстае ў яго творах сакральнай тэрыторыяй, своеасаблівым храмам прыроды. Ён надзелены ўласнай мовай, праз якую чалавеку даецца адчуванне быццёвай шматстайнасці. «Лес не нямы: і ўлісточку, / і ў кволенькай жылцы / мова тчэцца лясная / з мільярдаў лясных галасоў» [9, с. 55]. Вобразы жыхароў лясных абшараў у міфалагічна пераўвасобленым свеце паэтычнай уявы ўспрымаюцца істотамі, з якімі чалавек паяднаны драматычнай сувяззю братэрства-змагання. Воўк з аднайменнага верша А. Сыса – у пэўным сэнсе двайнік лірычнага героя. «Куды ні пайду: і ў полі, і ў лесе, і ў лаўжох за вёскаю цікуе за мною воўк. Мы звыкліся і палюбілі адзін аднаго нянавісцю. А мая стрэльба ахоўвала нас» [9, с. 38].

**Заключэнне.** Тэма лесу ўвасабляецца ў творах беларускай літаратуры ў шматстайнасці жанравых і стылявых форм. Яна спалучаецца ў творчасці беларускіх аўтараў з многімі іншымі тэмамі і матывамі. Асаблівае месца ў мастацкай сістэме нацыянальнай літаратуры займаюць вобразы-сімвалы, якія ўвасабляюць адвечнасць прыроднага свету. У творах беларускіх аўтараў выяўляецца занепакоенасць станам зберажэння ляснога багацця, гучыць заклік да ашчаднага стаўлення да прыроды.

## Літаратура

1. Колас Я. Збор твораў: у 20 т. Мінск: Беларус. навука, 2009. Т. 8. 347 с.
2. Панчанка П. Лясныя воблакі: Вершы. Мінск: Маст. літ., 1985. 78 с.
3. Пысін А. Мае мерыдыяны: Лірыка. Мінск: Беларусь, 1965. 128 с.
4. Пысін А. Да людзей ідучы: Вершы. Мінск: Маст. літ., 1972. 112 с.
5. Пысін А. Твае далоні: Вершы і паэмы. Мінск: Беларусь, 1967. 136 с.
6. Навуменка І. Збор твораў: у 10 т. Мінск: Маст. літ., 2014. Т. 4. 846 с.
7. Купрэеў М. Палеская элегія: аповесці. Мінск: Литература и искусство, 2007. 312 с.
8. Разанаў А. Адраджэнне. Мінск: Беларусь, 1970. 48 с.
9. Сыс А. Пан Лес: Вершы. Мінск: Маст. літ., 1989. 111 с.

## References

1. Kolas Y. *Zbor tvorau: u 20 t.* [Collected Works: in 20 v.]. Minsk, Belarus. navuka Publ., 2009. Vol. 8. 347 p.
2. Panchanka P. *Lyasnyya voblaki: Vershy* [Forest Clouds: Poems]. Minsk, Mast. lit. Publ., 1985. 78 p.
3. Pysin A. *Maye merydyyany: Liryka* [My Meridians: Lyrics]. Minsk, Belarus Publ., 1965. 128 p.
4. Pysin A. *Da lyudzey iduczy: Vershy* [Coming to People: Poems]. Minsk, Mast. lit. Publ., 1972. 112 p.
5. Pysin A. *Tvae daloni: Vershy i paemy* [Your Palms: Poems]. Minsk, Belarus Publ., 1967. 137 p.
6. Navumenka I. *Zbor tvorau: u 10 t.* [Collected Works: in 10 v.]. Minsk, Mast. lit. Publ., 2014. V. 4. 846 p.
7. Kupreyeu M. *Paleskaya elegiya: Apovestsi* [Elegy of Palesye: Story]. Minsk, Literatyra i iskusstvo Publ., 2007. 312 p.
8. Razanau A. *Adradzhenne* [The Revival]. Minsk, Belarus Publ., 1970. 48 p.
9. Sys A. *Pan Les: Vershy* [Pan Forest: Poems]. Minsk, Mast. lit. Publ., 1989. 111 p.

## Інфармацыя пра аўтара

**Гараднiцкі Яўген Андрэевіч** – кандыдат філалагічных навук, дацэнт, намеснік дырэктара. Інстытут літаратуразнаўства імя Янкі Купалы Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі (220072, г. Мінск, вул. Сурганава, 1, корп. 2, Рэспубліка Беларусь). E-mail: jaharad@mail.ru

## Information about the author

**Haradnitski Yauhen Andreevich** – PhD (Philology), Assistant Professor, vice-director. Institute of Literary Studies named after Yanka Kupala, Research Center of the Belarusian Culture, Language and Literature of the National Academy of Sciences of Belarus (1, k. 2, Surhanava str., 220072, Minsk, Republic of Belarus). E-mail: jaharad@mail.ru

*Паступіў 25.03.2016*